ЛЮБОЎ ДА РОДНАГА КРАЮ — ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ

Аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры, які ўпершыню адкрыўся ў нашай бібліятэцы, ставіць мэтай сабраць у першую чаргу літаратуру аб Беларусі і асабліва аб Віцебшчыне, яе гісторыі, прыродных рэсурсах, развіцці культуры і навукі, народнай гаспадарцы, аб людзях, якія праславілі родны край.

Спадзяёмся, што наша работа будзе спрыяць выхаванню пачуцця савецкага патрыятызму, любві да Радзімы, гордасці за сваю зямлю. Ужо цяпер у фондах аддзела сабрана каля чатырох тысяч кніг аб Беларусі і Віцебшчыне. Імкнёмся ўсяляк раскрыць і прыблізіць краязнаўчы фонд да чытачоў шляхам арганізацыі кніжных выставак і шырокіх праглядаў літаратуры. Цікавымі маюць быць канферэнцыі, літаратурныя вечары, сустрэчы са знатнымі землякамі, беларускімі пісьменнікамі і паэтамі.

У нашы планы ўваходзіць таксама складанне і выданне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, як рэкамендацыйных, прызначаных для шырокага кола чытачоў, так і навукова-інфармацыйных — у мэтах садзейнічання партыйным, гаспадарчым і навуковым арганізацыям вобласці ў вывучэнні і распрацоўцы пытанняў эканомікі, гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Зараз наш аддзел выдае каляндар знамянальных і памятных дат па Віцебскай вобласці. Ён дапаможа настаўнікам гісторыі, лектарам, прапагандыстам — усім, хто жадае лепш пазнаць свой край, пазнаёміцца з краязнаўчай літаратурай, а работнікам бібліятэк і культасветустаноў — шырэй прапагандаваць гэту літаратуру. У календары адзначаюцца знамянальныя і памятныя даты, якія адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця вобласці, а таксама юбілейныя даты выдатных дзеячоў, звязаных з нашым Прыдзвіннем.

Л. БЯЗЗУБІК.